# Нашы юбіляры

## АЛЯКСАНДР МІКАЛАЕВІЧ ДАНІЛАЎ



Споўнілася 50 гадоў вядомаму беларускаму вучонаму, намесніку старшыні Вышэйшай атэстацыйнай камісіі Рэспублікі Беларусь, члену-карэспандэнту НАН Беларусі, доктару сацыялагічных навук, прафесару Аляксандру Мікалаевічу Данілаву.

А.М. Данілаў нарадзіўся 14 мая 1955 г. у г. Віцебску. У 1980 г. скончыў адну са старэйшых ВНУ Беларусі - Віцебскі ветэрынарны інстытут. Ужо ў студэнцкія гады акрэслілася яго цікавасць да сацыяльных праблем тагачаснага грамадства, асабліва да праблем студэнцкай моладзі. Таму яго першыя навуковыя публікацыі, якія пабачылі свет у 1985-1986 гг., былі прысвечаны пытанням фарміравання палітычнай культуры і аптымальнай структуры патрэбнасцей моладзі. Гэтаму ў значнай ступені спрыяла яго непасрэдная шматгадовая праца з моладдзю: на працягу 1978-1991 гг. А.М. Данілаў працаваў сакратаром камітэта камсамола інстытута, загадчыкам аддзела Віцебскага абласнога камітэта ЛКСМ Беларусі, загадчыкам аддзела і загадчыкам сацыялагічнай лабараторыі ЦК ЛКСМ Беларусі. Найбольш значныя вынікі сацыялагічных даследаванняў, якія ажыццяўляліся Апяксандрам Мікалаевічам у той час, знайшлі сваё адлюстраванне ў шэрагу калектыўных манаграфій з яго ўдзелам: «Дыялог з моладдзю: 100 пытанняў - 100 адказаў» (Мн., 1986), «Сям'я і моладзь: прафілактыка дэвіянтных паводзін» (Мн., 1989), «Моладзь і дэмакратызацыя савецкага грамадства: сацыялагічны аналіз» (Мн., 1990), «Чалавек і рынак (сацыялагічны маніторынг)» (Мн., 1992), а таксама ў асабіста ім напісанай манаграфіі «Пераходны працэс і моладзь» (Мн., 1993).

Пасля абароны ў 1990 г. кандыдацкай дысертацыі на тэму «Сацыялагічны аналіз духоўных патрэбнасцей моладзі (па матэрыялах Беларускай ССР)» А.М. Данілаў у 1991-1994 гг. працаваў галоўным спецыялістам (сацыёлагам), загадчыкам сектара, загадчыкам аддзела Упраўлення інфармацыі і грамадскіх сувязей Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. З 1994 па 2000 г. ён быў загадчыкам сектара вывучэння грамадскай думкі і прагназіравання, намеснікам начальніка Галоўнага ўпраўлення грамадска-палітычнай інфармацыі, начальнікам Інфармацыйна-аналітычнага ўпраўлення Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Шырокая і разнастайная інфармацыя аб стане беларускага грамадства, з якой даводзілася працаваць А.М. Данілаву ў гэты няпросты перыяд, стварала надзейную фактычную базу для новых сацыялагічных даследаванняў. Атрыманыя падчас такіх даследаванняў вынікі былі пакладзены ў аснову абароненай у 1993 г. доктарскай дысертацыі па сацыялогіі на тэму «Моладзь Рэспублікі Беларусь ва ўмовах пераходу да рынкавых адносін (метадалагічны аспект)», а таксама шэрага асабіста ім напісаных манаграфій: «Пераходнае грамадства: праблемы сістэмнай трансфармацыі» (Мн., 1997; 2-е выд. Мн., 1998), «Улада і грамадства: пошук новай гармоніі» (Мн., 1998), «Моладзь

крызісных гадоў: ілюзіі і новыя надзеі» (Мн., 1999); «Сацыялогія ўлады: тэорыя і практыка глабалізму» (Мн., 2001) і звыш 200 навуковых артыкулаў.

Прафесар А.М. Данілаў праявіў сябе не толькі як здольны даследчык сацыяльна-палітычных працэсаў, але і як буйны арганізатар сацыялагічнай навукі Беларусі. Менавіта дзякуючы яго арганізатарскім здольнасцям і асабістым намаганням створаны першы ў нашай краіне навукова-тэарэтычны часопіс "Сацыялогія", нязменным галоўным рэдактарам якога А.М. Данілаў з'яўляецца з 1997 г., удалося аднавіць дзейнасць Беларускай сацыялагічнай асацыяцыі. Ён стаў ініцыятарам, арганізатарам і рэдактарам выдання "Сацыялагічнай энцыклапедыі" (Мн., 2003). Шмат увагі надае Аляксандр Мікалаевіч падрыхтоўцы сацыялагічных кадраў: з 1991 г. ён выкладае сацыялогію студэнтам БДУ, ажыццяўляе навуковае кіраўніцтва работай аспірантаў, кансультуе дактарантаў.

Вялікі навуковы і навукова-арганізацыйны ўклад А.М. Данілава ў развіццё беларускага грамадазнаўства па заслугах ацэнены навуковай супольнасцю нашай краіны. Так, у 1996 г. ён абраны членам-карэспандэнтам Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, а ў 1997 г. - правадзейным членам Міжнароднай акадэміі навук вышэйшай школы. Два тэрміны запар ён быў абраны на пасаду намесніка акадэміка-сакратара Аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі і старшынёй Беларускага грамадскага аб'яднання "Сацыялагічнае таварыства". Акрамя таго, з 1999 г. А.М. Данілаў займае выбарную пасаду намесніка старшыні Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў.

Свой юбілей А.М. Данілаў сустрэў у росквіце творчых сіл. Калегі па працы, сябры і прыхільнікі даследніцкага таленту вучонага шчыра віншуюць Аляксандра Мікалаевіча з юбілеем і жадаюць яму новых творчых поспехаў і здзяйсненняў.

***Беларускае грамадскае аб'яднанне "Сацыялагічнае таварыства",***
***кафедра сацыялогіі,***
***Цэнтр сацыялагічных і палітычных даследаванняў БДУ***